**Семінар-практыкум для педагогаў**
**"Сучасныя падыходы да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту"**

*(аўтар – Хламко Т.О., выхавальнік-метадыст дзяржаўнай установы адукацыі "Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці № 7 г. Ваўкавыска")*

*Мэта:* удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў па папулярызацыі і пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы ва ўстанове дашкольнай адукацыі.

*Катэгорыя удзельнікаў:* выхавальнікі дашкольнай адукацыі.

*Матэрыялы і абсталяванне*: плакаты з выказваннямі аб значэнні беларускай мовы; мікрафон; прыказкі і прымаўкі пра радзіму; метадычны дапаможнік "Я пазнаю Бедарусь" па далучэнню дашкольнікаў да беларускай мовы і нацыянальнай культуры; вершы ваўкавыскіх паэтаў В. Макуця "Мой Ваўкавыск" і В.Хмары "Твар радзімы", верш П.Прыходзька "Мы забыць сваю мову не мусім"; 2 ватмана, маркеры 2-х колераў.

*Папярэдняя работа:*

1. Азнаямленне ўдзельнікаў з тэмай семінару.
2. Інфармацыя выхавальніка-метадыста па матэрыялах інструктыўна-метадычнага пісьма Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь да 2017/2018 навучальнага года (установы дашкольнай адукацыі).
3. Інфармацыя па выніках павышэння кваліфікацыі "Фарміраванне асноў нацыянальнай самасвядомасці ў дзяцей дашкольнага ўзросту".
4. Кансультацыя "Лінгвакультуралагічны падыход да развіцця маўлення і культуры маўленчых зносін у дзяцей дашкольнага ўзросту".
5. Выкананне дамашняга задання (вывучыць вершы на памяць – для маладых спецыялістаў; падрыхтаваць агітацыйна-інфармацыйны лісток для бацькоў "Гучы, родная мова!"– для выхавальнікаў дашкольнай адукацыі з вопытам работы).

*Ход семінара-практыкума*

*1. Уступная частка.*

1.1. Чытанне верша П.Прыходзька "Мы забыць сваю мову не мусім" *(дадатак 1).*

1.2. Інтэрактыўныя практыкаванні на згуртаванне групы, развіццё камунікатыўных уменняў педагогаў на пачатковым этапе мерапрыемства.
Інтэрактыўная гульня "Прывітанне" *(дадатак 2).*

1.3. Практыкаванне "Закончы фразу".
*(Вядучы вызывае ўдзельнікаў стаць у круг і прапануе з дапамогай мікрафона закончыць фразу "Выхоўваць у дашкольнікаў каштоўныя адносіны да роднай мовы неабходна для таго, каб..." Кожны з удзельнікаў па чарзе адказвае на пытанне, перадаючы мікрафон. Вядучы падводзіць вынік.)*

*В.:* Яшчэ К.Д. Ушынскі пісаў, што "ўвесь след свайго духоўнага жыцця народ клапатліва захоўвае ў родным слове", менавіта таму родная мова – гэта "вялікі настаўнік для дзіцяці".

Далучэнне дзяцей да каштоўнасцей нацыянальнай культуры прадугледжвае ўключэнне ў змест адукацыі культуразнаўчых, перш за ўсё, мастацкіх тэкстаў (народных казак, паданняў, легенд), што адлюстроўваюць культурныя асаблівасці беларускага народа. На аснове такіх тэкстаў адбываецца азнаямленне з культурным вопытам народа, этычнае і эстэтычнае ўздзеянне на думкі, пачуцці і паводзіны дзяцей.

Фарміраванню ў дзяцей каштоўнаснага стаўлення да нацыянальнай мовы садзейнічае ўключэнне ў змест навучання выказванняў пра Беларусь і беларускую мову.

На працягу навучальнага года мы, педагогі, выкарыстоўваем розныя выхаваўчыя сродкі, каб актывізаваць дзейнасць у гэтым накірунку. Іх рэалізацыя адбываецца на фізкультурных занятках з выкарыстаннем народных гульняў, на рухава-творчых занятках, заснаваных на розных відах вуснай народнай творчасці і беларускіх народных гульнях (лічылкі, забаўлянкі, пальчыкавыя гульні), на музычных занятках, у час правядзення народных свят і г.д.

*2. Інфармацыйны блок.*

2.1.Актуалізацыя праблемы.

*В.:* Развіццё ў дзяцей дашкольнага ўзросту маўлення на нацыянальнай мове ў сілу сацыялінгвістычнай сітуацыі - блізкароднаснага двухмоў'я - набывае ў нашай краіне некаторыя спецыфічныя рысы. Сучаснае беларускае дзіця дашкольнага ўзросту ўдзельнічае ў культурным жыцці і традыцыях беларускага народа, але спасцігае культуру ў значнай ступені сродкамі рускай мовы.

У сувязі з гэтым узнікае задача як мага раней – з моманту наведвання дзіцём установы дашкольнай адукацыі – далучэння да роднага слова шляхам увядзення ў нацыянальна-культурны фон беларускай мовы. У гэтым выпадку маўленчыя механізмы, што фарміруюцца ў дзіцяці, забяспечваюць нацыянальнае бачанне навакольнай рэчаіснасці.

На думку вучоных, найбольш каштоўны матэрыял для развіцця беларускага маўлення ў дзяцей ранняга ўзросту, надаюць творы вуснай народнай творчасці, у першую чаргу фальклорныя.

Адукацыйны працэс навучання беларускай мове будуецца на аснове вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі. На кожным узроставым этапе ён мае свае асаблівасці і рэалізуецца праз асобныя задачы, сістэматычна і планамерна, з выкарыстаннем розных метадаў, прыёмаў і сродкаў, з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей выхаванцаў.

2.2. Рэклама метадычнага дапаможніка "Я пазнаю Беларусь" па далучэнню дашкольнікаў да беларускай мовы і нацыянальнай культуры.

2.3. "Літаратурная хвілінка".

*Запрашаюцца 2 выхавальніка - маладыя спецыялісты, якія чытаюць на памяць вершы ваўкавыскіх паэтаў па матэрыялах кнігі "Люблю цябе, мая старонка", складальнік В.М.Курылік (дамашняе заданне) (дадатак 3).*

2.4. Прэзентацыя агітацыйна-інфармацыйных ліcткоў для бацькоў "Гучы, родная мова!".

*Выходзяць 2 выхавальніка, якія выконвалі дамашняе заданне (рыхтавалі агітацыйнацыйную інфармацыю на тэму: “Гучы, родная мова!”). Па чарзе чытаюць складзеныя лісты. Вядучы падводзіць вынік.*

2.5. Практычная частка.

Дзяленне на каманды з дапамогай прыказак.

*Кожнаму ўдзельніку даецца ліст, на якім надрукавана асобнае слова. На працягу 3-х хвілін неабходна скласці з прапанаваных слоў прымаўку ці прыказку (дадатак 4). Удзельнікі выконваюць заданне, па выніках работы складаюцца 2 каманды, вядучы прапануе кожнай камандзе даць назву.*

2.6. Бліц-турнір «Адкажы на пытанне» (дадатак 5).

2.7. Педагагічны практыкум “Лепшы плакат”.

*Кожнай камандзе даецца заданне: першай камандзе - скласці плакат з пералікам форм работы з выхаванцамі па папулярызацыі беларускай мовы, для другой - плакат з пералікам форм работы з бацькамі па фарміраванні ўсведамлёных адносін па папулярызацыі беларускай мовы і далучэння дзяцей да роднай мовы. На выкананне работы даецца 5-10 хвілін. Пасля ўдзельнікі абменьваюцца плакатамі і дапісваюць свае варыянты.*

2.8. Практыкаванне “Назаві больш…”

*Камандам прапануецца: першай камандзе - назваць як мага больш беларускіх народных гульняў (“Гарлачык”, “Грушка”, “У мядзведзя на бару”, “У гусі”, “У ката і мышку” і інш.); другой камандзе - назваць як мага больш беларускіх народных казак (“Пра быка і яго сяброў”, “Лёгкі хлеб”, “Не сілай, а розумам”, “Зайкава хатка”, “Коцік, пеўнік і лісіца”, “Як курачка пеўніка ратавала”, “Каза-манюка”, Курачка-Раба”, “Дзедава рукавічка”, “Коцік Петрык і мышка” і інш.)*

2.9. Інсцэніроўка-пантаміма «У госці да казкі».

*Кожная каманда рыхтуе і паказвае пантаміму да беларускіх народных казак (першая каманда - казку «Як курачка пеўніка ратавала”, другая - казку “Коцік, пеўнік і лісіца”). На падрыхтоўку даецца 5 хвілін. Каманды па чарзе паказваюць і разгадваюць зашыфраваныя творы.*

3. Падвядзенне выніку семінара-практыкума.

3.1. Выпрацоўка рэкамендацый па тэме семінара-практыкума.

3.2. Рэфлексія. Метад “Сінквейн” (дадатак 6).

Камандам прапануецца прыдумаць і запісаць, выкарыстоўваючы метад “Сінквейн”, вынік семінару. На прыканцы ўдзельнікі зачытваюць свае адказы, абмяркоўваюць свае думкі.

**Дадатак 1**

## Мы забыць сваю мову не мусім

Мы забыць сваю мову не мусім
Каб агеньчык яе не загас!
Пазнаюць нас, што з Беларусі,

Па гаворцы, па нашых вачах.
Ціха звоніць у полі калоссе,
Зоркі свецяцца ў вышыні.
Наша родная мова прыносіць
Столькі ласкі, святла, цеплыні.

П. Прыходзька

**Дадатак 2**

**Інтэрактыўная гульня “Прывітанне”**

*Мэта:* стварэнне творчага пазітыўнага настрою.

*Інструкцыя.* Удзельнікі сядзяць на крэслах. Вядучы вымаўляе фразы. Тых, каго тычацца выказванні, устаюць з месца, астатнія ім апладыруюць. У канцы вядучы падводзіць вынік.

Сустрэнем апладысментамі тых, хто:

спявае дзецям беларускія калыханкі;
ведае беларускія народныя гульні;
выкарыстоўвае рэцэпты страў беларускай народнай кухні;
аддае перавагу беларускім тэлевізійным каналам;
ведае і спявае беларускія народныя песні;
чытае творы мастацкай літаратуры на роднай мове;
выкарыстоўвае багаты матэрыял вуснай народнай творчасці ў педагагічнай практыцы.

**Дадатак 3**

**Твар радзімы**

То ўзгоркі, то даліны,
То ўзлесі, то лясы –
Гэта твар маёй радзімы
Непаўторнае красы.
Зрэдку плыткія рачулкі
Паскараюць к рэчкам бег.
Шлях іх ціхі і не гулкі,
Бо ўзялі малы разбег.
Нясуць у мора флегматычна
Рэчкі скарб сваёй зямлі,
Вады чыстае, крынічной,
Што назапасілі палі.
Спеў птушыны, пералівы,
У нябёсах перазвон,
Пад ім лепей спеюць нівы,
Неабсяжны іх загон.
Ўсё ў прыродзе любіць ласку,
Ўсё купаецца ў цяпле,
А за полем бае казку
Лес ў сінеючай імгле.

*(В. Хмара)*

**Мой Ваўкавыск**

Мой Ваўкавыск, струмень святла крыніцы…
Заўжды табой я буду ганарыцца!
Тваіх лясоў вакол магутнай песняй,
Тваіх палёў прасторай паднябеснай!
І чысцінёй празрыстага паветра,
І тайнай, што хаваюць твае нетры…

У завіхінцы дзён, гадоў, стагоддзяў
Струмень твайго жыцця гучыць у народзе.
Твая прыязнасць да гасцей лагодных,
Твая адказнасць за прытулак родны!

Дзе ў час легенды Ваўкалак завые,
Там шпацыруюць сёння маладыя.
Дзе басанож блукаў, скакаў, як конік,
Там сёння выязджаюць дзіва-коні!
Дзе лётаў я, як дзьмухавец няўдалы,-
Растуць там сёння новыя кварталы!

Ты нарадзіў мяне – і я з табою
Сябе атаямляю. Быццам двое.
Мы разам шлях прайшлі тысячагалодны…
Мой Ваўкавыск – вялікі і лагодны!

*( В. Макуць)*

**Дадатак 4**

**Прыказкі і прымаўкі**

1. Той Бацькаўшчыну любіць, хто ёй сумленна служыць.
2. Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка.

**Дадатак 5**

**Бліц-турнір “Адкажы на пытанне”**

1. Пералічыце задачы па развіцці мовы дзяцей дашкольнага ўзросту. *Адказ: слоўнікавая работа (разумець і называць словы), гукавая культура маўлення, фарміраванне граматычнага ладу маўлення, развіццё звязнага маўлення і маўленчых зносін.*

2. Што мы разумеем пад развіццём мовы дзіцяці?

*Адказ: развіццё мовы — гэта творчы працэс, які фарміруецца ў выніку ўспрымання мовы дарослых, асабістай моўнай актыўнасці і элементарнага ўсведамлення з’яў языка і мовы.*

3. Назавіце задачы слоўнікавай работы.

*Адказ: пашырэнне, узбагачэнне, актывізацыя слоўнікавага запасу дзяцей.*

4. Што ўключае ў сябе работа па фарміраванні граматычнага ладу маўлення дашкольнікаў?

*Адказ: работу над марфалогіяй (змяненне па родзе, ліку, склоне), лексікай (утварэнне аднаго слова на базе іншага), сінтаксісам (будова простых і складаных сказаў).*

5. Што такое дыялог?

*Адказ: дыялог — гэта размова дзвюх або некалькіх асоб на тэму, звязаную з якой-небудзь сітуацыяй.*

6. Што такое маналог?

*Адказ: маналог — гэта маўленне адной асобы, якое накіравана да слухачоў.*

**Дадатак 6**

**Рэфлексія "Сінквейн"**

1 радок - галоўнае слова па тэме семінара (1 назоўнік);
2 радок – характарыстыка аб'екта (2 прыметніка);
3 радок – дзеянні, здзейсненыя аб'ектам (3 дзейніка);
4 радок - фраза, аўтарскія адносіны да аб'екта (4 слова);
5 радок – 1 слова, своеасаблівае рэзюмэ-характарыстыка аб'екта (дзейнік ці прыслоўе).

*Літаратура*

Інструктыўна-метадычнае пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь да 2017/2018 навучальнага года (установы дашкольнай адукацыі).

Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі: вучэбнае выданне. Мінск : НІА, 2012. – 407 с.

Дубініна, Д.М. Родныя вобразы ў паэтычным слове: дапам. Для педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі: у 2 ч. Ч. 1 / Дз. М. Дубініна. – Мазыр: ТАА ВД "Белы Вецер", 2008. – 136, [4] с.

Люблю цябе, мая старонка : зборнік вершаў : да 75-годдзя з дня ўтварэння Ваўкавыскага раёна і 1010-годдзя горада Ваўкавыска : склад. В . М. Курылік. – Гродна : Гродзенская друкарня, 2014. - 256 с.

Хамылёва, С. Р. Методическая карусель : семинары для педагогов в учреждении дошкольного образования : из опыта работы / С.Р. Хамылёва. – Гродно : ГУО «Гродненский областной институт развития образования», 2016. – 80 с.